


# Гродзенскі ўніверсітэт

ГАЗЕТА УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

Выдаецца з 1986 года ● № 7 (301) ● *31 жніўня 2002 года, субота*

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


## З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!



## ЖАДАЕМ ПОСПЕХАЎ!

Паважаныя калегі, студэнты, магістранты, аспіранты, першакурснікі!

Сардэчна віншуем вас з новым навучальным годам. Асобна хочацца звярнуцца да першакурснікаў, якія сёлета папоўнілі шэраг студэнтаў. Жадаем вам, шаноўныя, стаць дастойнымі студэнтамі, з гонарам працягваць слаўныя традыцыі нашай ВНУ.

Сёння універсітэт — шматпрофільная навучальная ўстанова. На ўсіх формах навучання налічваецца больш за дзесяць тысяч студэнтаў. Тэарэтычныя і практычныя веды ім даюць больш за 1300 выкладчыкаў, якія працуюць на 66 кафедрах.

Універсітэт адзначыў 60-гадовы юбілей, а ў наступным годзе будзе святкаваць 25-годдзе з дня заснавання універсітэта, які быў пераўтвораны з педагагічнага інстытута. За гэтыя гады шмат якія змены адбыліся ў жыцці ВНУ, але адно засталося нязменным: высакародная мэта — падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў для школ рэгіёну, для самых розных галін народнай гаспадаркі.

Хочацца верыць, што і новае пакаленне студэнтаў будзе добра вучыцца, каб прынесці карысць Радзіме, стаць дастойнымі людзьмі, спецыялістамі.

Поспехаў вам!

**Рэктарат, прафкам, Савет ветэранаў**

***По предварительным сведениям на 26 августа на первый курс по всем формам обучения в университет зачислены 1562 человека***

### ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Рэктарат, прафкам, Савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

- 1 верасня — **Івана Аляксандравіча БАСЮКА** — дацэнта кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.
- 5 верасня — **Анатоля Яўгенавіча ЛАЎСКАГА** — дворніка інтэрната №2.
- 6 верасня — **Міру Уладзіміраўну КАСПЕРКА** — старшага выкладчыка кафедры алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі.
- 6 верасня — **Станіславу Эдвардаўну БЯЛОВУ** — старшага касіра бухгалтэрыі.
- 9 верасня — **Юрыя Міхайлавіча РЫЧКОВА** — загадчыка кафедры радыёфізікі і электронікі.
- 19 верасня — **Людмілу Іванаўну ГРАМЫКА** — загадчыка лабараторыі кафедры біятэхналогіі.
- 30 верасня — **Аляксандра Мікалаевіча НЕЧУХРЫНА** — дэкана гістарычнага факультэта.
- 30 верасня — **Аркадзя Сяргеевіча ПЛЮСНІНА** — інжынера па забеспячэнню.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

***«То, что мы знаем, — ограничено, а то, чего мы не знаем, — бесконечно».***

***П.Лаплас***

## День славянской письменности

Славянские народы всегда отличались уникальной исторической памятью и уважением к людям, оставившим нам в наследство свои замечательные открытия. 24 мая праздновали День славянской письменности — день, когда усилиями знаменитых просветителей на свет родилась славянская азбука.

Стало традицией ежегодно отмечать этот праздник на филологическом факультете. И на этот раз 24 мая преподаватели и студенты собрались вместе, чтобы отметить этот замечательный праздник просвещения и культуры. Знаменательно, что День славянской письменности совпал с Днями Москвы в Беларуси. Представители Северо-западного округа Москвы гостили в Гродно. Своим присутствием нас почтил гость — профессор, доктор филологических наук, декан филологического факультета Московской государственной Академии славянской культуры Александр Николаевич Ужанков.

После вступительного слова нашего гостя и сообщения доцента кафедры общего и славянского языкознания С.А.Емельяновой о первых восточнославянских книгах-азбуках началось представление, подготовленное студентами-первокурсниками. Студенты продемонстрировали не только хорошие знания в области славянской филологии, но и таланты. Звучали авторские песни, посвященные Кириллу и Мефодию. Были проведены игры-викторины, в которых приняли участие не только студенты, но и преподаватели.

День славянской письменности прошел интересно и занимательно. Он останется надолго в памяти всех присутствовавших.

**А.НЕВГЕНЬ,**
**студентка 1 курса отделения русской и классической филологии**



## У ДОБРЫ ШЛЯХ, ВЫПУСКНІКІ!

У шэрагу слаўных традыцый нашага універсітэта добра стасавалася і новая: урачыстае ўручэнне дыпломаў выпускнікам. Пачатак гэтай важнай і прыгожай традыцыі пайшоў з аднаго з старэйшых — гістарычнага факультэта.

Святочная актавая зала галоўнага корпуса. Месцы заняты выпускнікамі, іх сябрамі, выкладчыкамі. Да пачатку пасяджэння дэманструецца дакументальны фільм пра універсітэт, створаны нашым творчым аб'яднаннем "Ракурс". І вось — урачыстая хвіліна: на сцэне з'яўляюцца рэктар універсітэта прафесар С.А.Маскевіч, дэкан гістарычнага факультэта А.М.Нечухрын — абодва ў мантыях. Месцы ў прэзідыуме займаюць выкладчыкі гістарычнага факультэта, госці. Гучыць гімн універсітэта. Урачыстае пасяджэнне адкрыў дэкан гістарычнага факультэта прафесар, доктар гістарычных навук А.М.Нечухрын. Ён прадаставіў слова рэктару.

— Дарагія выпускнікі! — сказаў прафесар С.А.Маскевіч. — Я віншую вас з нагоды заканчэння універсітэта. Сёння вы можаце ўспомніць тое, што было пяць гадоў таму: як вы хваляваліся, паступаючы ва універсітэт. Хацелася б, каб вы не памыліліся ў сваім выбары, каб тыя веды, што далі вам выкладчыкі, дапамагалі вам у жыцці і рабоце. Гістарычны факультэт мае даўнюю гісторыю. Яго закончылі ў свой час людзі, якімі ганарыцца універсітэт. Жадаю, каб вы знайшлі сваё месца ў жыцці, каб захавалі сяброўства і ўсё светлае, што знайшлі ў сценах універсітэта. Я ўпэўнены, што краіна атрымала годных спецыялістаў. Шчаслівага вам жыццёвага шляху!

Затым з прывітаннем выступіў дэкан гістарычнага факультэта А.М.-Нечухрын. Цёплыя словы выпускнікам сказалі прафесары І.П.Крэнь і В.М.Чарапіца, выпускнік гістарычнага факультэта дырэктар СШ №5 Прысяч. Дыпломы з адзнакай выпускнікам уручыў рэктар. Адзін за адным падымаюцца на сцэну Аксана Бубновіч, Алена Грынцэвіч, Вольга Дабрыян, Марыя Арапчык, Аляксандр Мініч, Ірына Прысяч і іншыя. Здзіўляешся, як шмат на факультэце выдатнікаў, якія яны маладыя, прыгожыя, поўныя сілаў.



**Людміла ДАНІЛАВА,**
**Людміла ВОЙДА (фота)**

# ПОБЕДИТЕЛИ ОЛИМПИАДЫ




В январе 2002 года были подведены итоги Второй Всероссийской Олимпиады по экономическим и финансовым дисциплинам, которая проводилась Общероссийской общественной организацией «Молодежный Союз Экономистов и Финансистов (МСЭФ)» среди всех молодых экономистов и финансистов Российской Федерации и Республики Беларусь в возрасте до 30 лет как добровольное научно-исследовательское мероприятие, призванное активизировать научно-исследовательскую деятельность молодых экономистов и финансистов.

Елена Урбанович и Анна Урбанович (студентки IV курса факультета экономики и управления специальности «Экономика и управление на предприятии») стали победителями Второй Всероссийской Олимпиады.

Елене Урбанович присуждено первое место в номинации «Стратегическое управление» за работу «Формирование стратегии развития предприятия».

Анне Урбанович присуждено второе место в номинации «Предотвращение банкротства и антикризисное управление» за работу «Антикризисное управление в процессе банкротства предприятия».

Научным руководителем конкурсных работ являлся кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой экономики и управления предприятия Учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» Феликс Борисович Марголин.

Оценка работ проводилась конкурсной комиссией, в состав которой вошли видные ученые в области народного хозяйства и финансов, руководители предприятий народного хозяйства России.

Во Второй Всероссийской Олимпиаде приняли участие около полутора тысяч студентов, молодых ученых, молодых преподавателей и молодых специалистов. Участники Олимпиады представляли 230 вузов России и Республики Беларусь и 63 субъекта хозяйствования Российской Федерации.

В торжественной обстановке в г. Москве проходила церемония награждения победителей Второй Всероссийской Олимпиады по экономическим и финансовым дисциплинам. Видные ученые в области народного хозяйства и финансов, руководители предприятий народного хозяйства России награждали победителей призами и дипломами. 294 конкурсным работам присуждены призовые места, 52 — специальные призы «За методологический подход в научной работе». Пять специальных номинаций было установлено российскими компаниями и СМИ. 6 конкурсных работ признаны победителями в специальных номинациях и 2 получили специальные призы.

35 вузов Российской Федерации и 2 вуза Республики Беларусь (в частности, Гродненский государственный университет имени Янки Купалы и Белорусский государственный экономический университет) стали победителями в номинации «За организацию научно-исследовательской работы студентов». 19 субъектов РФ и РБ признаны лучшими в номинации «За содействие активному участию в Олимпиаде». В итоговых мероприятиях приняли участие представители (студенты, аспиранты и молодые ученые, преподаватели) 73 регионов РФ (Пермская, Воронежская, Мурманская области, Ставропольский край, г. Москва, Свердловская область, Республика Татарстан, Калужская, Кемеровская, Ульяновская области, Удмуртская Республика, Нижегородская, Челябинская, Владимирская, Волгоградская, Ростовская области и др.) и Республика Беларусь. Это — 238 вузов и одна средняя школа России, четыре вуза РБ (Гродненский государственный университет им. Я.Купалы, Белорусский государственный экономический университет, Белорусский государственный университет и Белорусская государственная политехническая академия), один орган исполнительной власти субъекта РФ, 16 хозяйственных субъектов России.

По нашему мнению, Олимпиада является важным событием в процессе подготовки управленческих кадров, в формировании нового делового сообщества в России и Беларуси. Об этом свидетельствуют широкий отклик и понимание значения Олимпиады, слова благодарности Молодежному Союзу Экономистов и Финансистов РФ, поддержка инициативы проведения Олимпиады со стороны Министерства образования, Министерства экономического развития и торговли, Министерства по налогам и сборам, аппарата полномочного представителя президента в Сибирском федеральном округе, Центрального банка России, Государственной думы России; компаний «Алроса», «Носта», «Аэрофлот», «Интеррос» и других. 30 марта 2002 г. проходила Первая Всероссийская научно-практическая ежегодная конференция «Развитие системы экономического образования в России» в Российской Инженерной Академии менеджмента и агробизнеса (Московская обл.), где обсуждались наиболее актуальные проблемы развития экономического образования. Были рассмотрены примеры успешного совершенствования отдельных частей системы экономического образования на примере вузов и заинтересованных организаций, передовой опыт, вопросы функционирования и развития системы экономического образования и работы образовательных учреждений (вопросы в области организации учебного и научного процессов, практики и трудоустройства и т.д.), высказывались мнения по совершенствованию системы экономического образования и ее отдельных элементов, вырабатывались практические рекомендации по улучшению системы экономического образования и т.д. Студенты ГрГУ выступили с докладом «Как повысить эффективность обучения управленческих кадров».

31 марта 2002 г. проходил III Съезд МСЭФ, где подводились итоги работы Второй Всероссийской Олимпиады, намечались планы дальнейших мероприятий и высказывались слова благодарности организаторам за интересную и содержательную программу и дружеский прием, прекрасную организацию. Хотелось бы отметить и насыщенную культурную программу, в частности, незабываемую прогулку по вечерней Москве, экскурсии на Красную площадь, по Ярославское шоссе, Садовому кольцу, Лубянке, на Воробьевы горы, Поклонную гору, в Олимпийский комплекс «Лужники», компанию «Лукойл», в МГУ им. М.В.Ломоносова и др.

Безусловно, такие проекты и программы способствуют приобретению и новых знаний в области экономики, установлению творческих контактов, интересных знакомств и обмену опытом, поддерживают идеи молодых людей, которые стремятся к научно-исследовательской деятельности.

Хотелось бы поблагодарить ректорат ГрГУ и деканат за содействие в поездке.

**На снимке: на церемонии награждения**

# «АПОШНІ ГЕРОЙ»

Практыка студэнтаў II курса факультэта біялогіі і экалогіі нейкім чынам нагадвае вядомую тэлегульню "Апошні герой". Праўда, тут, у Пагаранах, усё побач — і горад, і любімыя выкладчыкі Вольга Віктараўна Янчурэвіч і Яўген Іванавіч Якалцэвіч. Кожны дзень прыязджае загадчык гаспадаркі Пётр Цярэнцьевіч Рыбакоў. А ў дзень, аб якім сёння ідзе гаворка, базу практыкі ў Пагаранах наведалі рэктар універсітэта С.А.Маскевіч, прарэктар па навучальна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях І.П.Мартынаў, дэкан факультэта біялогіі і экалогіі Г.Я.Мінюк, прарэктар па гаспадарчай рабоце М.Ф.Кантаровіч.

Што ўразіла, дык гэта настрой студэнтаў — бадзёры, радасны. Гэта была першая група, якая праходзіла практыку на базе ў Пагаранах. А першым заўсёды цяжэй. Таму і пачуваліся спачатку студэнты ніякавата: як яно там будзе? Усе прывыклі да гарадскога жыцця, да ўмоў, калі не трэба грэць ваду і г.д.

— У нас тут усё цудоўна, — гаворыць студэнтка Таццяна Кавальчук. Слухаем спевы птушак, збіраем ягады. Практыка ў нас па флярыстыцы. Трэба сабраць гербарый з ста відаў раслін. Ходзім у пойму Нёмана — там вельмі шмат відаў. Праводзяцца ў нас і культурныя мерапрыемствы. Было ўрачыстае адкрыццё нашай практыкі з конкурсамі, песнямі.

Тут пабудаваны і басейн, і саўна, але пакуль што яны не працавалі. Але студэнты не сумуюць: раніцай мыюцца, потым робяць ранішнюю зарадку пад акардэон.

Ежу гатуюць дзяжурныя па чарзе. Прадукты закупілі ў горадзе, ад'язджаючы на практыку.

Атрымліваецца, што студэнты знаходзяцца на практыцы кругласутачна, ідзе поўнае пагружэнне ў прыроду, і ў дадатак — аздараўленне. Для навуковага гербарыя студэнты знайшлі рэдкія расліны. Паспяхова працавалі і практыканты па геабатаніцы: знайшлі гнёзды птушак, вызначылі іх галасы, на Нёмане адшукалі баброўя хаткі, ноччу ездзілі за тры кіламетры, каб гаспадароў іх пабачыць. Студэнты выказваюць пажаданне, каб практыка падраздзялялася на вясновую, летнюю і зімовую. На базе Пагараны створаны для гэтага ндрэнныя ўмовы: тут ёсць сад, мяркуецца закласці цяпліцу. База належала прадпрыемству "Гроднаэнерга", цяпер перададзена на баланс ГрДУ імя Я.Купалы, і універсітэт тут поўны гаспадар. Патрэбны толькі, як сказаў на сустрэчы з студэнтамі-практыкантамі рэктар С.А. Маскевіч, ідэі. Дарэчы, сустрэча з кіраўніцтвам прайшла арганізавана, цёпла.

— База для батанічнай работы выдатная, — гаворыць Андрэй Сайкоўскі. — Добра і тое, што мы маглі быць разам, ладзім конкурсы, дыскатэкі. Дарэчы, у нашай групе — удзельнік КВЗ, які заняў першае месца ва універсітэце, Аляксандр Маляўка. Ён іграў на баяне і гітары. Адным словам, было цудоўна...

**Людміла ДАНІЛАВА**

# ВСТРЕТИМСЯ В INTERNET

Летнее затишье в коридорах университета — это не только пора отпусков, но и время для подведения итогов работы в учебном году, анализа выполненного, построения планов на будущий год и отработки экспериментальных моделей.

Лето-2002 для отдела телекоммуникаций и сетевых технологий ЦИиА не прошло даром. Впервые была апробирована уникальная для вузов нашей страны система информирования о работе приемной комиссии с помощью www-страницы. Абитуриенты и все заинтересованные могли с помощью Internet в режиме реального времени получать текущую информацию из системы АСУ "Абитуриент" на странице www.grsu.by/abit. Эксперимент показал, что университет уже готов к организации доступа к данным систем АСУ с помощью веб-технологий для сотрудников и различных категорий руководителей. Реализация этого проекта продемострировала курс университета на открытость и стала возможна благодаря совместной работе многих специалистов, администрации, работников приемной комиссии.

Для вуза самым важным информационным институтом была и остается научная библиотека. Усилиями ее сотрудников создана регулярно пополняемая веб-страница, содержащая необходимую информацию о библиотеке, оказываемых услугах и главное — о книгах, базах данных, информационных ресурсах города и мира. Особую гордость составляет единственная в Беларуси база полнотекстовых учебных пособий, которая сейчас содержит 79 единиц, но к 2003 году увеличится в несколько раз. Кроме того, уже осенью станет доступна новая поисковая система электронного каталога, основанная на вводимой в эксплуатацию ИАИС «Библиотека». В следующем году пользователи смогут получить виртуальный доступ к фондам раритетных изданий. Всё это можно увидеть в Internet по адресу www.grsu.by/lib.

Приоритетным направлением развития в университете является организация доступа к Internet. В настоящее время идут переговоры с несколькими провайдерами о расширении имеющихся у университета каналов доступа к Internet в несколько раз. Уже в сентябре будет реализована первая часть проекта, и пользователи смогут оперативнее работать с мировыми информационными ресурсами. Также осенью будет введен с строй новый корпоративный сервер электронной почты и новый WWW-сервер. В ближайших планах создание Internet-класса, организация работы пользователей электронной почты с помощью веб-технологий и развитие других Internet-сервисов.

К новому учебному году обновилась ЛВС. Заменены и модернизированы отдельные участки магистральных и внутренних кабелей, установлено новое оборудование оптоволоконной связи, в рамках проекта НИКС установлены системы коммуникаций с другими учебными заведениями. Разработаны проекты дальнейшей модернизации корпоративной сети. В первой половине сентября будет введена в эксплуатацию линия связи ЛВС с факультетом психологии (здание «Гродногражданпроект»). К концу года улучшится качество работы сегментов сети в учебном корпусе №3 (БЛК, 5) и в новой части главного корпуса. К сожалению, пока городские телекоммуникационные ресурсы не позволяют подключить к общей сети университета издательский отдел (ул. Пушкина, 39). Сегодня корпоративная сеть университета — это более 15 км оптоволоконных и обычных коммуникаций, 650 компьютеров и других сетевых устройств.

**Евгений ОЛИЗАРОВИЧ,**
**начальник отдела телекоммуникаций и сетевых технологий ЦиИА.**

# В советах по защите диссертаций

20 июня советом К 02.14.03 при ГрГУ им. Я.Купалы (председатель совета — доктор философских наук, профессор У.Д.Розенфельд, ученый секретарь совета — кандидат философских наук, доцент Г.Н.Щелбанина) присуждена ученая степень кандидата философских наук по специальности 24.00.01 — теория и история культуры Наталье Сергеевне Шершеневич. Ее работа выполнена в ГрГУ им. Я.Купалы под руководством доктора философских наук, профессора У.Д.Розенфельда.

28 июня советом К 02.14.01 при ГрГУ им. Я. Купалы (председатель совета — доктор юридических наук, профессор Н.В.Сильченко, ученый секретарь совета — кандидат юридических наук, доцент О.Н.Толочко) присуждены ученые степени кандидата юридических наук по специальности 12.00.01 — теория и история права и государства; история правовых учений Александру Леонидовичу Белоусову и Сергею Николаевичу Снопу. Работы А.Л. Белоусова и С.Н.Снопа выполнены в ГрГУ им. Я.Купалы под руководством доктора юридических наук, профессора Н.В.Сильченко.

**Н. НЕЧУХРИНА,**
**методист высшей категории научного отдела**

Да, сейчас эти строки звучат для меня совсем иначе, чем тогда, когда я писал их в стенгазету, поздравляя педагогов школы №19 г. Гродно с Днем учителя. Сейчас я студент Гродненского университета им. Я.Купалы, но, придя в свою родную школу, чувствую — я дома. Такое чувство, что вернулся в родительский дом после долгого отсутствия.

Моя школа преобразилась: в ней появилось много новых прекрасных преподавателей; компьютерные классы оборудованы хорошей техникой; все классы стали более уютными. Мне не хотелось покидать эту «сказку»... Я не мог не заметить чистоту и ухоженность помещений. Красиво оформленные стенды органично вписываются в интерьер. Информация, представленная на них, не является сухим набором символов, а дополнена рисунками и диаграммами.

Да, эта школа дает все условия для обучения, развития и раскрытия талантов ее учеников. Не зря ведь она носит гордое название: физико-техническая школа-лицей №19 при ГрГУ им. Я.Купалы. Около 95 % воспитанников школы становятся студентами высших учебных заведений бюджетной формы обучения, они всегда блистают на олимпиадах по физике, информатике, биологии и по другим предметам. Все учащиеся, поступившие в этот лицей, обязательно находят в себе таланты к наукам, чуткие учителя помогают найти в каждом ученике его «изюминку», именно ту струнку души, которая со временем становится «золотой жилой» большой науки.

Мы были все смешными малышами,
Когда пришли впервые в этот класс,
И, получив тетрадь с карандашами,
За парту сели первый в жизни раз.

Вы повели нас по дороге знаний,
Отдав нам много силы и труда,
А сколько приложили вы стараний,
Чтоб мы учились хорошо всегда.
Спасибо вам, что вы нас так любили,
Хотя и строги были к нам подчас,
За то, что вы нас мыслить научили,
За все, за все, что сделали для нас...

**Сергей ЛЯНЦЕВ**

# ДНИ НАУКИ «ЛИЦЕЙ 2002»

# ЕСТЬ В ГРОДНО ТАКАЯ ШКОЛА...

Весной, 23-24 апреля 2002 года, на базе физико-технической школы-лицея №19 при ГрГУ им. Я.Купалы проходили дни науки «Лицей 2002».

В рамках программы Дней науки впервые проводился ***областной научно-методический семинар*** учителей физики, организованный совместно филиалом кафедры лазерной физики и спектроскопии ГрГУ (руководители: зав. кафедрой, доктор физико-математических наук, профессор Ануфрик С.С., доцент кафедры ЛФиС, кандидат пед. наук Хуторская Л.Н.) и учебно-методическим отделом по физике Гродненского областного ИПК (начальник отдела Губич Л.П.). В семинаре приняли участие учителя физики 1-й и высшей категорий из Ивья, Скиделя, Березовки, Мостов, Слонима, Озер, Вороново, из двух сельских школ, СШ № 20 и 23 г.Гродно, из Гродненского училища олимпийского резерва, технологического колледжа г.Гродно и др.

Кафедрой ЛФиС подготовлены рекомендации «В помощь учителю физики» / Под ред. Л.Н.Хуторской. — Гродно: ГрГУ, 2002. — 104 с. В них обсуждаются вопросы, посвященные эффективным технологиям обучающей деятельности учителя физики, описаны методы, средства и формы обучения и организации самостоятельной продуктивной деятельности учащихся.

Важно, что школа-лицей №19, работая в тесном контакте с университетом, областным ИПК, используя научно-технический потенциал вуза и высокий профессионализм преподавателей и ученых, становится научно-методическим областным центром. Целенаправленное создание системы корпоративного взаимодействия этих учреждений помогает более интенсивно развить инновационные процессы в сфере образования, содействовать повышению качества образования одаренной молодежи.

На ***научно-практическую конференцию школьников*** (секция физики) в школе-лицее собрались учащиеся из Гродно, Минска, Слонима и Щучина.

О перспективах развития лицейского образования, об успехах и достижениях учащихся в научной деятельности, о планах развития физико-технического факультета ГрГУ рассказали декан факультета Гачко Г.А., представитель администрации Гродненского отдела образования Орлова С.П, заведующий кафедрой методики преподавания физики и информатики БГУ Слободянюк А.И. Трудно переоценить пользу конференции для молодых участников.

На секции физики учащиеся докладывали о своих самостоятельных исследованиях, выполненных под руководством учителя — научного наставника.

Ученические исследования были отмечены наградами. Дипломы I степени и медали получили Гецевич А. (СШ №19 г.Гродно), Тимофеев Ю. (СШ №15 г.Слонима); Буйдович П. и Шугаев А. (лицей БГУ, Минск). Особенно следует выделить доклад Тимофеева Ю. «Исследование явления электромагнитной индукции для защиты электроизмерительных приборов переменного тока». Докладчик разработал и продемонстрировал уникальную конструкцию, позволяющую отключать измерительную аппаратуру при перегрузках в цепи, что имеет большое практическое значение.

Дипломом II степени награждена Капитанова Е. (СШ №19 г.Гродно), рассмотревшая методы исследования магнитных полей. Дипломом III степени были отмечены два доклада: Козловского А. и Гришука С., Буйко А., Ягодвика А. Козловский А. (лицей БГУ г.Минска) выступил с докладом «Изучение нелинейных колебаний». Гришук С., Буйко А. и Ягодвик А. (СШ №8 г.Слонима) представили на суд жюри обучающую программу по физике «Архимед», разработанную в виде Internet-странички с использованием 3D Studio MAX программы моделирования.

Похвальные грамоты получили Цвирко Е., Сорока А. Сорока А.

Анализ объективной оценки членами жюри или оргкомитетом результатов творческой деятельности учащихся, учителей, представленных в докладах ученической научной конференции, показывает, что она нуждается в разработке комплекса количественных и качественных критериев. Например, важно определить: 1) каков характер творческой деятельности ученика, представленной в исследовании; 2) какими знаниями и умениями обладает ученик при успешном выполнении представленного исследования (выходят ли они за рамки уже усвоенных им в школе); 3) какая часть предлагаемой учеником работы выполнена на исполнительском уровне, а какая потребовала его творческой деятельности; 4) какова степень самостоятельности ученика при выполнении исследования; 5) какова степень владения учеником материалом, терминами, формулами при выступлении на конференции; 6) какова практическая ценность предложенного ученикcом устройства, потребность в его изготовлении и др.

С развитием и реформированием образования на современном этапе уточняются, углубляются, совершенствуются наши представления о школе, о вузе, о том, какие требования мы можем и должны предъявлять и к школьным учителям, и к вузовским преподавателям. В качестве пожеланий можно высказать следующие. Во-первых, необходимо расширить число участников и за счет этого распределить между ними поочередные сроки проведения дней науки с возможностью организации и проведения не только областных, но республиканских и международных научно-практических конференций «Лицеисты и гимназисты в познании наук». Во-вторых, требует адекватного определения система оценивания образовательных продуктов учащихся — их исследований и докладов, а также работы их научных наставников. В-третьих, целесообразна организация оргкомитетом поисковых конкурсов, исследовательских проектов по решению научно-практических задач и научных проблем. В-четвертых, необходимо обязательное представление жюри докладов учащихся на бумажном и электронном вариантах с последующей их публикацией. В-пятых, оргкомитету целесообразно организовывать в течение года проведение различных мероприятий научно-практического характера, в частности, лектория по актуальным проблемам науки и техники.

**Л.Н.ХУТОРСКАЯ,**
**доцент кафедры лазерной физики.**

## Талент сумленнасці

Бог надзяліў яе талентам сумленнасці і справядлівасці. І гэта не гучныя словы, калі ўявіць яе сёння з намі, яе сябрамі і калегамі.

Яна ніколі не гаварыла гучна, пагрозліва, як часам бывае ў жыцці з нашым братам. Яна ўмела, як ніхто, сказаць адкрыта ў вочы, што не атрымалася, чаму выйшла менавіта так, а не інакш. І самае цікавае, што яе словы не перахоплівалі дыханне, не прымушалі апускаць галаву, чырванець, бы злоўленага за руку злодзея. Яе словы былі настолькі шчырыя, настолькі праўдзівыя, што не глядзець ёй у вочы было амаль немагчыма. Яна заўсёды ўмела трымаць сябе ў руках, ніколі, нават драбняткую рысачкаю, не выдавала сваіх цяжкасцей і непрыемнасцей. Умела цярпець і перацярпець, хаваючы глыбока на донцы душы свой боль і крыўду, няўважлівыя адносіны з боку іншых.

Яе любілі і паважалі калегі, нават крыху пабойваліся, бо на ўсіх і на ўсё яна глядзела праз прызму сумленнасці і справядлівасці. Умела, як ніхто, парадавацца поспехам і ўдачам сваіх сяброў, калег, студэнтаў.

Яна пайшла і засталася... Пайшла з жыцця і засталася з намі ў памяці сумленнай і справядлівай, прыгожай і маладой Нінай Васільеўнай Тарэлкінай, нашай Нінай.

**П.МАЛЯЎКА, дацэнт кафедры беларускай літаратуры**



Н.В. ТАРЭЛКІНА

## УСПАМІНЫ БЫЛОГА СТУДЭНТА

Некалі, паступаючы ў канцы 80-х гадоў ва універсітэт, я шчыра верыў, што менавіта тут будуць вучыць нас самыя лепшыя, самыя дасведчаныя, апантаныя сваёй справай людзі. Так яно, на шчасце, і сталася.

І з самых першых дзён нас чакала сустрэча з Нінай Васільеўнай Тарэлкінай. Вельмі спакойная і аднначасова захоплена натхнёная жанчына з мяккімі рухамі і прыемным голасам чытала нам курс старажытнай беларускай літаратуры. Дарэчы, на першым курсе я быў упэўнены, што слова «чытала» ў адносінах да лекцыі — чыстая ўмоўнасць. Ніна Васільеўна, як большасць выкладчыкаў, не карысталася дапамогай ніякіх запісаў. Тое, што яна нам расказвала, было не проста ведамі. Здавалася, гэта былі яе ўласныя перажыванні, выпакутаваныя думкі, асабістыя ўспаміны. Так яно і было.

Ніна Васільеўна прымала студэнтаў такімі, якія яны ёсць, разумеючы і нашу ляноту, і пасіўнасць, і нейкую недысцыплінаванасць. Яна выкладала курс, дзе шмат гаварылася пра Бога, пра апантанае служэнне ідэі, пра вернасць народу і нацыі. Яна прыносіла альбомы рэпрадукцый і прасіла зазірнуць у вочы іконам. Упэўнены, сама яна жыла па тых жа прынцыпах.

А мы — маладыя і жорсткія — пасмейваліся над яе вялікімі акулярамі, над яе захопленымі інтанацыямі, над яе шчырай верай у тое, што мы падзелім яе погляды. Зараз мне не сорамна за нас тых. Гэта — прывілея юнацтва, і Ніна Васільеўна ўсё разумела. Ад яе выходзіла нейкая па-сапраўднаму матчына дабрыня і спагада. Студэнты многае ведаюць пра сваіх выкладчыкаў. І мы таксама ўжо ведалі і пра неўладкаванае жыццё Ніны Васільеўны, і пра скрушлівую адзіноту. Таму пасля ўжо «па-даросламу» радаваліся, калі жыццё яе пачало паступова наладжвацца.

Яна была сапраўдным педагогам. Я выразна памятаю яе радасць ад добрых адказаў студэнтаў на практычных занятках і асабліва на экзаменах. Яна, здаецца, успрымала гэта як поспехі блізкіх людзей. Хто

## МЭТА ЖЫЦЦЯ — СЛУЖЭННЕ БЕЛАРУСІ

Дзесяцігадовае знаёмства з Нінай Васільеўнай Тарэлкінай значыла для мяне вельмі многа. І вось ужо дзесяць гадоў давялося пражыць без яе, а сэрца кожны раз баліць ад думкі пра гэтую незваротную, заўчасную страту.

Спачатку Ніна спадабалася мне як шчыры сімпатычны чалавек, з якім лёгка і цікава было гутарыць пра ўсё. Ды ці мяне адну прывабілівалі яе добразычлівасць, мілы гумар, гатоўнасць прыйсці на дапамогу? Эрудыцыя, разнастайнасць інтарэсаў, арыгінальны склад мыслення натуральна рабілі Ніну цэнтрам прыгожага і змястоўнага сумоўя, якое высока цанілі многія. Мяне заўсёды здзіўляла інтэнсіўнасць Ніннага духоўнага жыцця. Чытанне, падарожжы, выставы, спектаклі, сустрэчы, жыццёвыя выпадкі — усё нараджала ў яе душы глыбокія ўражанні і ўсім гэтым ёй хацелася падзяліцца з сябрамі. Я хутка адчула, як непараўнальна многа значыць для Ніны сяброўства. Дзеля сябра яна ніколі не шкадавала ні ўласных высілкаў, ні вольнага часу. Дзеля сябра яна магла проста ў вочы сказаць і горкую праўду — менавіта каб дапамагчы, а не каб пакрыўдзіць, хоць разумелі гэта не ўсе...

З такою ж самаадданасцю Ніна працавала як выкладчык і як навуковец. Памятаю бліскучую абарону яе кандыдацкай дысертацыі «Станаўленне стылю беларускай літаратуры XIX стагоддзя (В.Дунін-Марцінкевіч, Ф.Багушэвіч)» у Інстытуце літаратуры АН Беларусі ў 1985 годзе. Памятаю яе лекцыі пра рэнесансную культуру Беларусі, пра беларускую бурлескную паэзію, яе цікавы спецкурс, прысвечаны праблемам мастацкага перакладу. Узровень філалагічнай падрыхтаванасці дацэнта Тарэлкінай быў вельмі высокі. Асабліва ж захапляла мяне тое, як прафесійна і самастойна Ніна аналізавала літаратурныя з'явы, не баючыся, што яе меркаванні могуць камусьці не спадабацца, здацца няправільнымі. І гэта была зусім не танная самаўпэўненасць, а адкрытасць для дыялогу, жаданне разам з суразмоўцамі наблізіцца да ісціны. Гэтаму ж Ніна Васільеўна вучыла і студэнтаў. Ці, дакладней сказаць, трапляючы ў поле прыцягнення яе таленту і абаяльнасці, людзі ўвачавідкі выраслі над сабою (я і сама адчула гэта).

Памятаю, як Ніна чытала вершы М.Багдановіча на вечарыне ў нядаўна адкрытым Максімавым музеі. Памятаю, з якім натхненнем яна ўдзельнічала ў пасяджэннях клуба «Паходня», як святкавалі — ці не ўпершыню ў горадзе? — Дзяды пад пільным кантролем стражаў парадку. Памятаю лекцыю Ніны, звернутую не да студэнтаў ва універсітэцкай аўдыторыі, а да ўважлівых і ўдзячных, хоць і нешматлікіх слухачоў у летнім тэатры гродзенскага парку. Гаворка ішла пра Ф.Багушэвіча, яго служэнне нацыянальнай культуры і мове, і я разумела, што для Ніны гэтая лекцыя — не сумны грамадскі абавязак, а таксама служэнне.

Ва ўсведамленні Ніны служэнне Беларусі было не гучнымі словамі, а мэтай жыцця. І тут варта ўдакладніць, што час нашага сяброўства — 1982—1992 г., — колькі б ні іранізавалі зараз, пастфактум, з нагоды «перабудовы» — быў пераломным у лёсе нашай краіны. Мы радаваліся, што жыццё навокал вызваляецца з-пад шматгадовых напластаванняў хлусні, спадзяваліся на поспех новага нацыянальнага адраджэння. Ніна была свядомай удзельніцай гэтага працэсу, што таксама выклікала да яе глыбокую павагу.

У жыцці Ніна была і засталася для мяне ўзорам высокай маральнай годнасці і прафесіяналізму. Яе адыход прымусіў пакутаваць не толькі ад болю заўчаснай разлукі, але і ад невырашальнасці вечных пытанняў быцця.

**В.НІКІФАРАВА**

за нас, за нашы поспехі, акрамя родных і блізкіх, так радаваўся?

Дзень, калі прыйшла да мяне трагічная вестка, не захаваўся ў памяці. Магчыма, светаўспрыманне маладых ашчаджае і аберагае іх будучую памяць, захоўваючы толькі добрае і светлае. І, мабыць, у гэтым мудрасць нашага свету. Тая мудрасць, якую ведала Ніна Васільеўна.

А пасля, праз некалькі гадоў, я па яе дысертацыі вучыўся фармуляваць свае думкі. Па канспектах яе лекцый рыхтаваўся ўжо да сваіх заняткаў. І сёння часамі, адкрыўшы рэдкую бібліятэчную кнігу, убачыш экслібрыс Тарэлкінай. Пасля смерці Ніны Васільеўны многія кнігі з яе прыватнай бібліятэкі былі з удзячнасцю прыняты універсітэтам. Нават праз гэта яна здолела пакінуць свой след. Гартаючы старонкі мудрасці і прыгажосці, пачуеш шэлест папяровых крылаў птушкі-ўспаміну...

**А.РАМАНЧУК,**
**студэнт ГрДУ 1988-1993 г.,**
**выкладчык**

## ЯНА ТАКСАМА БЫЛА...

Мне ўвесь час даводзілася ісці ўслед за Нінай Васільеўнай. І ў аспірантуры, дзе ў нас быў адзін кіраўнік, і на кафедры. Можна лічыць, што мы так і не сустрэліся, бо шлях яе абарваўся. Яна засталася ў маім уяўленні жанчынай-загадкай, невядомай і разам з тым чамусьці надзвычай блізкай. Мо таму, што вельмі хораша згадваў пра яе незабыўны Мікола Архіпавіч Янкоўскі. Яе трагічны сыход уразіў мо нават не столькі нечаканасцю, колькі нелагічнасцю. Але такія ўчынкі хіба што не могуць быць зразумелымі. Таму я паспрабавала не столькі асэнсаваць гэта, колькі адчуць. Верш — гэта маё ўяўленне пра тое, што здарылася 18.07.1992 году.

### Я НЕ ПАМЕРЛА
*Ніне*

Гэта праўда, мяне ўжо няма
на тых сцежках, дзе я хадзіла.
Тыя сцежкі — мая турма.
Я сышла.
Я ўцякла.
Я рашыла:
адракаюся ад усяго,
што з зямлёю мяне зрадняла,
ад няшчасця —
каханне твайго,
ад гарачай тваёй пяшчоты.

Нехта скажа, мо нават з жалем,
што памерла ад адзіноты.

**А.ПЕТРУШКЕВІЧ.**

## Зычліва глядзела на свет

Часам бывае, што ўспаміны нават пра самых блізкіх людзей, з якімі жыў бок а бок, застаюцца абрывістымі. І, як бы ні напружваў памяць, як бы ні прымушаў сябе ўспомніць, нічога не атрымаецца.

З Нінай Васільеўнай увогуле, можна сказаць, у мяне былі толькі фрагменты сустрэч. Але, на дзіва, яны запомніліся ўсе і досыць ярка.

...Экзамен па беларускай літаратуры, які прымае Ніна Васільеўна. Яна ўважліва слухае адказ, чуць схіліўшы на бок галаву і прыжмурыўшы сумнаватыя вочы. Гэта яе пастава і запомнілася. Спакойны твар, лагодная ўсмешка, зычлівасць у поглядзе. Здаецца, яна так заўсёды глядзела на свет.

Пазней мы ўжо сустрэліся як калегі, як раз незадоўга да яе зыходу. Не змянілася яе аблічча, толькі суму, магчыма, пабольшала ў спантаных і задумлівых вачах. А ў словах тая ж заўсёдняя ўвага, дабрыня, шчырае імкненне паразумецца з чалавекам.

Не паспела Ніна Васільеўна пакінуць пасля сябе сваіх кніг, засталося некалькі артыкулаў. Здавалася, хто будзе гэта помніць?!

Але часам на асобных кнігах у бібліятэцы факультэта заўважыцца на вокладцы яе росчырк, і здагадваешся, гэта належыла ёй, яна гэта чытала. І з сумам уздыхнецца, успомніцца...

Відаць, сапраўды памерлыя застаюцца жывымі, пакуль ёсць жывыя, каб іх успомніць.

**С.М.ТАРАСАВА,**
**ст. выкладчык кафедры беларускай літаратуры.**

# Рядом...

*«Каждое утро я говорю себе: Здравствуй! Мне это помогает жить...»*
*(Из разговора)*

Теперь все чаще звучат прогнозы, что XXI век станет веком психологии. Сегодня ученые и философы говорят о ситуации техноглобалистического дисбаланса в нашем обществе, когда развитие науки и техники значительно опережает развитие сферы человеческих отношений. Все чаще человек попадает в ситуацию нехватки общения, все меньше остается времени на то, чтобы остановиться и взглянуть на себя, уделить должное внимание чувствам — своим и тех, кто для нас дорог.

Люди способны на гораздо большее, чем они о себе думают. Замечательной метафорой является образ шкафчика, в котором до поры до времени хранятся инструменты, приспособления, оборудование, материалы. Что-то лежит там не один год, что-то совершенно забывается. Но оно там есть, им можно воспользоваться, пусть даже хозяин забыл о его существовании или не вспомнит, для чего же это нужно. И действительно, через какое-то время такой шкафчик может превратиться в склад нужных вещей, а хозяин может, к своему удивлению, обнаружить, сколько там полезного.

Каждый из нас попадает в ситуации, когда необходим кто-то другой, кто поможет, напомнит о таком шкафчике внутри нас, тот, кто напомнит, где лежит самое необходимое в данный момент. Им может стать кто-то близкий — друг или психолог.

В Гродненском государственном университете имени Янки Купалы уже два года работает Психологическая служба, где оказывают профессиональную психологическую помощь студентам и сотрудникам университета.

В службу обращаются студенты, столкнувшиеся с проблемами. Говорят о том, что скучно, что невелик круг понастоящему насыщенного и интересного общения, о своих ощущениях бессмысленности стараний, о своей неуверенности в будущем, о трудностях в начале профессиональной деятельности. Все это приводит, как следствие, к потере интереса к учебе. Приходят ребята, проживающие в общежитиях. Они решают огромное количество на первый взгляд простых, но в действительности очень серьезных вопросов о сложностях в общении с людьми, с которыми они оказываются под «одной крышей»: «Нет друзей... Все отворачиваются от меня... Чувствую себя одиноким...» или, наоборот, «Хочется побыть одному... Чувствую ответственность перед родителями за свои успехи в учебе, боюсь не оправдать их ожиданий»... Еще недавние школьники, приходя в студенческую среду, встречаются с новыми правилами и нормами, адаптируются к новому кругу общения, с которым приходится взаимодействовать. Иногда возникают проблемы, которые хочется решить, но не всегда знаешь, как это сделать. Люди разные, и проблемы, которые они решают, у каждого свои, и, конечно, самые серьезные. Важно, чтобы в нужный момент, когда человек проявляет желание, а иногда и очень тяжело дающуюся ему смелость встретиться лицом к лицу со своими проблемами, рядом оказался человек, способный помочь найти необходимые «материалы, оборудование, инструменты».

Основное направление работы университетской Психологической службы — это психологическое консультирование студентов, сотрудников и их семей. К нам можно обратиться и тем, кто хочет узнать больше о своих способностях и возможностях, пройдя индивидуальную диагностику.

Обратившись за помощью к психологу, человек находит решение своих проблем, учится справляться с ними самостоятельно, получая драгоценную свободу и уверенность в своих возможностях, жизненный оптимизм и успех в профессиональных начинаниях, что является необходимым фактором для начала достойной взрослой и самостоятельной жизни каждого молодого человека.

Наш адрес: ул. Доватора, 27, 1 этаж, студенческое общежитие № 2.

# Первокурсник, знакомься: ПРОФКОМ СТУДЕНТОВ

Традиционно студенты, поступившие в Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», становятся членами профсоюза работников образования и науки.

Профсоюзный комитет студентов, аспирантов и магистрантов университета избирается на основании «Устава профессионального союза работников образования и науки Беларуси». Профком студентов осуществляет представительство перед администрацией университета от имени студентов по всем вопросам обучения, труда, быта, отдыха и пользуется правами юридического лица. Целью деятельности профкома студентов является защита интересов студентов.

Между профкомом студентов и администрацией заключено Соглашение по всем аспектам жизни и деятельности студентов в университете.

Чем занимается профком студентов?

- Организует общественный контроль за выполнением нормативных документов, касающихся обучения студентов, их социально-экономических и иных прав.
- Вносит руководству университета предложения по улучшению организации учебного процесса, производственной практики, рациональному использованию бюджета времени студентов, по составлению расписания экзаменов, зачетов, консультаций.
- Представители студенческого профкома пользуются в советах и комиссиях правом решающего голоса и выступают от имени профсоюзной организации.
- Участвует в разработке и принятии Устава вуза.
- Контролирует правильность и своевременность назначения и выплаты стипендий, командировочных расходов и различных пособий.
- Участвует через своих представителей в работе студенческих советов общежитий, принимает участие в осуществлении мероприятий по улучшению условий труда, быта и отдыха студентов, проводит воспитательную работу.
- Участвует в организации и проверке выполнения планов строительства, ремонта и оборудования студенческих общежитий, культурно-бытовых учреждений и спортивных сооружений, в контроле за правильным расходованием средств, ассигнованных на эти цели.
- Представители студенческого комитета участвуют в комиссиях по приему в эксплуатацию студенческих общежитий, культурно-бытовых учреждений и спортивных сооружений.
- Организует контроль за работой предприятий общественного питания, обслуживающих студентов.
- Оказывает помощь малообеспеченным студентам, студентам-сиротам, инвалидам, студенческим семьям.
- Направляет студентов на санаторно-курортное лечение, в дома отдыха и профилактории в Беларуси и за её пределами.
- Участвует в осуществлении практических мероприятий по совершенствованию лечебно-оздоровительной работы.
- Осуществляет общественный контроль за соблюдением законодательства и правил охраны труда и учебы.
- Вносит предложения в местные органы власти и управления, администрации вуза, в вышестоящие профсоюзные органы, направленные на решение учебных, социально-экономических и других проблем студентов.
- Совместно со студенческим и спортивным клубами проводит работу по организации досуга студентов.
- Взаимодействует в своей работе с различными общественными формированиями молодежи в Беларуси и за рубежом.

Совместно администрация и профком студентов проводят распределение мест в общежитии между факультетами; принимают решение о выделении жилой площади в общежитиях и продолжительности срока проживания.

Администрация университета назначает заведующих общежитиями, воспитателей, культорганизаторов и инструкторов по физкультуре с учетом мнения профкома студентов.

В 2001-2002 учебном году профком только из своих средств выплатил материальную помощь на сумму более 5 млн рублей. Израсходовано на проведение спортивных мероприятий около 900 тыс. рублей. При участии профкома и его непосредственной поддержке проведено большое количество культурно-массовых мероприятий (конкурс первокурсников, День знаний 1 сентября, конкурс «Мисс университета», День студента, КВН, День рождения университета, концерты СТЭМа «Вернисаж» и т.д.), на которые израсходовано около 7 млн. рублей.

По льготной цене распространялись абонементы в облдрамтеатр, билеты на городские концерты. Профком студентов принимал активное участие в подготовке и организации «Дней Гродненского государственного университета имени Янки Купалы в Белостоке», общеуниверситетского турслета «Unitour», первого и второго туров Высшей лиги «Белорусского КВН» в нашем городе.

При непосредственном участии студенческого профкома была создана сборная команда КВН «Янки», которая участвовала в 6 фестивалях МС Евролиги команд КВН, является финалистом Белорусского КВН 1999 года, полуфиналистом 2001 года. При участии профкома студентов создана секция славянских единоборств и секция интеллектуальных игр. Для студентов была организована встреча с ректором и руководством университета по вопросам жизнедеятельности университета. В нынешнем году также заключен договор между профкомом студентов Гродненского госуниверситета и профкомом студентов Одесского национального университета об оздоровлении студентов нашего университета на базе отдыха Одесского национального университета.

Профком активно сотрудничает со многими студенческими организациями в Беларуси, Москве, на Украине, в Приднестровье и Польше.

В профкоме можно приобрести международный студенческий билет ISIC, дающий скидку на многие виды услуг более чем в 95 странах мира.

Бюджет профсоюзного комитета студентов формируется за счет членских взносов, поступлений от университета и спонсоров, а также от концертной и иной деятельности, проводимой профсоюзным комитетом. Профсоюзные взносы у студентов бюджетной формы обучения удерживаются безналичным путем через бухгалтерию университета ежемесячно в размере 1 % от стипендии. Студенты, занимающиеся на договорной основе, один раз в полгода платят взносы из расчета 1 % от минимальной заработной платы за месяц.

Профсоюзный комитет поможет Вам реализоваться за время студенческой жизни и поможет избежать проблем в университете.

По всем вопросам и с любыми предложениями обращайтесь с 8.30 до 17.30 по рабочим дням в профком студентов: кабинет № 229 главного корпуса. Тел.: 44-50-54.

Председатель профкома студентов: Александр Александрович ГРИНЬ.

Зам. председателя: Игорь Леонидович КЕРГЕТ.

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы».
ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Пушкіна, 39, 230012, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:*
М.ВЕРСТАК,
В.КАРАСІК.
*Фотаілюстрацыя:*
Л.ВОЙДА.

*Здадзена ў набор 19.08.2002*
*Падпісана да друку: 27.08.2002 15.00*
*Заказ № 178*
Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Тыраж 500 экз.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас: ✉ 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 77-37-20.*